Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2015-02-20

Да неба і зорак

Іван Навуменка — таленавіты даследчык і творца, выдатны выкладчык, паважаны супрацоўнік, клапатлівы бацька... Да 90-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі ў літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылося адкрыццё выставы «Іван Навуменка. Мудрасць слова і жыцця». Большасць экспанатаў была прадастаўлена музею старэйшай дачкой пісьменніка Валерыяй Іванаўнай, якая ў час сустрэчы распавядала пра сваю сям'ю, згадвала цікавыя гісторыі з жыцця бабулі — бацькавай маці Марыі Пятроўны.

Супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, літаратуразнаўца Ігар Шаладонаў расказаў пра тое, як ішла праца над зборам твораў Івана Навуменкі. На думку даследчыка, «у мастацкай прозе Івана Якаўлевіча выразна выяўляецца сялянская жыццёвая трываласць, учэпісты характар палешука, устойлівасць да жыццёвых нягодаў, якія выпалі як на долю яго пакалення, так і на долю Беларусі».

Паводле Людмілы Карпавай, Іван Навуменка быў адной з «хадзячых энцыклапедый» філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. «Ён жыў у пісьменніцкім доме, я сябравала з яго дочкамі — але для мяне было вялікай адказнасцю здаваць Івану Якаўлевічу экзамены, рыхтавацца да яго спецсемінараў. Побач з такімі выкладчыкамі студэнты заўсёды імкнуліся быць прыгажэйшымі, разумнейшымі, лепшымі. Іван Навуменка быў з кагорты тых, хто вучыў не ўзірацца ў брудныя лужыны пад нагамі, а скіроўваць позірк вышэй, да неба і зорак».

Алеся ЛАПІЦКАЯ

Алеся Лапіцкая. Да неба і зорак